**Упраўленне адукацыі Мастоўскага райвыканкама**
**“Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”**

**Рэспубліканскі фестываль-конкурс праектаў навучэнцаў**
**“Нашчадкі традыцый”**

**Намінацыя “Народная творчасць: традыцыі і сучаснасць”**



# Праект
# “Кожнаму часу – свая маляванка”

Аўтары праекта:
Барук Анастасія, 13 гадоў,
Якімчык Ксенія, 11 гадоў,
Лапата Надзея, 12 гадоў,
навучэнцы студыі выяўленчага мастацтва “Дар”
дзяржаўнай установы адукацыі
“Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”.
Кіраўнікі-кансультанты праекта:
Сяргей Ганна Антонаўна,
педагог дадатковай адукацыі,
Глазкіна Ларыса Іванаўна,
загадчык аддзела

Масты
2021

Аўтары праекта:
Барук Анастасія, Якімчык Ксенія, Лапата Надзея, навучэнцы студыі выяўленчага мастацтва “Дар” дзяржаўнай установы адукацыі “Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”

Кіраўнікі-кансультанты праекта:
Сяргей Ганна Антонаўна, педагог дадатковай адукацыі, Глазкіна Ларыса Іванаўна, загадчык аддзела дзяржаўнай установы адукацыі “Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”

**Барук, А., Якімчык, К., Лапата, Н. Праект “Кожнаму часу – свая маляванка” /** А.Барук, К.Якімчык, Н.Лапата; Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі. – Масты, 2021. – 37 с.

У дадзеным зборніку прадстаўлены вопыт работы навучэнцаў студыі выяўленчага мастацтва “Дар” па рэалізацыі праекта “Кожнаму часу – свая маляванка”.

Матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў рабоце гурткоў выяўленчага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

© Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі», 2021

# Змест


Пашпарт праекта…………………………………………………………… 4

Этапы рэалізацыі праекта………………………………………………… 5

Уводзіны……………………………………………………………………… 9

Асноўная частка……………………………………………………………… 11

1. Народныя мастацкія рамёствы і промыслы Беларусі……….. 12
2. “Маляваныя дываны” як з’ява народнай культуры Беларусі … 16
3. Беларуская маляванка – у цэнтры сучасных мастацтваў……… 20

Заключэнне……………………………………………………………………….. 21

Спіс выкарыстанай літаратуры…………………………………………… 22

Дадатак 1. Анкетаванне “Беларуская маляванка” – гэта актуальна?»… 23

Дадатак 2. Майстар-клас "Выраб пано ў тэхніцы “маляванка”……………………………………………………………... 24
.

Дадатак 3. Метадычная распрацоўка па правядзенню майстар-класа па тэме "Выкананне роспісу кветкавай кампазіцыі ў тэхніцы “маляванка”…………………………………………………………… 26

Фотададатак………………………………………………………………… 29

# Пашпарт праекта

| | |
|---|---|
| **Назва праекта:** | “Кожнаму часу – свая маляванка” |
| **Тып праекта:**<br>па характару выніка – практыка-арыентаваны<br>па форме – майстар-класы, відэафільм<br>па характару дамінуючай дзейнасці: інфармацыйны, практычны<br>па прадметна-змястоўнай вобласці – міжпрадметны<br>па характару каардынацыі – з адкрытай каардынацыяй<br>па характару кантактаў – унутрыцэнтраўскі<br>па колькасці ўдзельнікаў – групавы<br>па працягласці – доўгатэрміновы | |
| **Адукацыйная вобласць:** | Выхаваўчая |
| **Метады:** | Інфармацыйна-пошукавы: збор інфармацыі, выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў;<br>даследчы: анкетаванне, аналіз і апрацоўка інфармацыі;<br>практычны: майстар-класы, мастацкія вырабы (пано, сумкі-шоперы, паштоўкі, тэкстыльныя падарункі), зробленыя ў стылі маляванкі |
| **Формы прадстаўлення:** | Удзел у раенных выставах дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў “Святочныя забавы”, “Добры дзень, свет!”, стварэнне відэароліка “Кожнаму часу – свая маляванка” |
| **Установы і арганізацыі, ва ўзаемадзеянні з якімі выконваецца праект** | Дзяржаўная ўстанова культуры “Мастоўскі раённы цэнтр рамёстваў” |

# Этапы рэалізацыі праекта

## 1 этап. Падрыхтоўчы – май 2021 года

**Мэта:** стварыць умовы для рэалізацыі праекта

| № п/п | Змест работы | Тэрмін | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Знаёмства з вопытам работы этнаскарбонкі Мастоўскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі | Май 2021 года | Сяргей Г.А., Глазкіна Л.І., удзельнікі праекта |
| 2. | Забеспячэнне навукова-папулярнай, метадычнай літаратурай па этнапедагогіцы, па гісторыі тэхнікі “маляванка” | Май 2021 года | Сяргей Г.А., Глазкіна Л.І., удзельнікі праекта |
| 3. | Сістэматызацыя метадычнага матэрыялу ў папкі: “Народныя мастацкія рамёствы і промыслы Беларусі”; “Народныя рамёствы Мастоўшчыны”; “Маляваныя дываны” як з’ява народнай культуры Беларусі” | Верасень, кастрычнік 2021 года | Сяргей Г.А., Глазкіна Л.І., удзельнікі праекта |

## 2 этап. Практычная рэалізацыя праекта – кастрычнік 2021 года – сакавік 2022 года

**Мэта:** рэалізацыя праекта

| № п/п | Змест работы | Тэрмін | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Анкетаванне “Беларуская маляванка – гэта актуальна?» (Дадатак 1) | Верасень 2021 года | Барук Анастасія |
| 2. | Супрацоўніцтва з Мастоўскім раённым цэнтрам рамёстваў. Наведванне выставы “Прыгожая казка” | Верасень 2021 года | Сяргей Г.А., Глазкіна Л.І., удзельнікі праекта |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Майстар-клас:<br>Паштоўка “Кветкавы рай” | | |
| 3. | Папаўненне бібліятэчнага фонду навукова-папулярнай і метадычнай літаратурай па тэме праекта | На працягу праекта | Глазкіна Л.І., удзельнікі праекта |
| 4. | Правядзенне майстар-класаў:<br>"Выраб пано ў тэхніцы традыцыйнага роспісу па тканіне “маляванка”;<br>Паштоўка “Віншую”;<br>“Святочны сувенір” | Кастрычнік 2021 года<br>Лістапад 2021 года<br>Сакавік 2022 года | Глазкіна Л.І., удзельнікі праекта |
| 5. | Удзел у выстаўках дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў:<br>“Прыгажосць Мастоўскага краю”;<br>“Нашым матулям”;<br>“Радасць творчасці” | Лістапад 2021 года<br>Сакавік 2022 года<br>Май 2022 года | Удзельнікі праекта |
| 6. | Арганізацыйна-аналітычная дзейнасць:<br>адсочванне працэсу рэалізацыі праекта, карэкцыя дзейнасці;<br>аналіз дзейнасці і падвядзенне прамежкавых вынікаў | На працягу дзейнасці праекта | Удзельнікі праекта |
| 7. | Стварэнне відэароліка “Кожнаму часу – свая маляванка” | Лістапад 2021 года, красавік 2022 года | Удзельнікі праекта |

## 3 этап. Заключны этап – красавік - май 2022 года

**Мэта:** рэфлексія, асэнсаванне, абагульненне і прэзентацыя вопыту

| № п/п | Змест работы | Тэрмін | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Удзел у выніковай выставе для навучэнцаў | Май 2022 года | Удзельнікі праекта |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | “Радасць творчасці” | | |
| 2. | Прадстаўленне і сістэматызацыя матэрыялу для ўдзелу ў конкурсе “Нашчадкі традыцый” | Лістапад 2021 года | Удзельнікі праекта |
| 3. | Прэзентацыя дзейнасці праекта на заключным мерапрыемстве для навучэнцаў гурткоў Мастоўскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі | Май 2022 года | Сяргей Г.А., удзельнікі праекта |

**Мэта праекта:** духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэнне народных традыцый і развіццё дзіцячай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва.

**Задачы:**

1. Павысіць і развіць матывацыю да даследчай дзейнасці і пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў.
2.Падтрымаць развіццё творчай ініцыятывы па выкарыстанню і распаўсюджванню мастацкіх традыцый.
3. Вывучыць гісторыю ўзнікнення вырабаў у тэхніцы “маляванка”.
4. Развіваць практычныя навыкі і творчыя здольнасці навучэнцаў сродкамі народнага мастацтва.
5. Удасканальваць этнакультурныя і даследчыя кампетэнцыі, майстэрства выканання і прэзентацыі мастацкіх твораў.
6. Прадэманстраваць свае навыкі працы, вырабы ў напрамку народнага мастацтва “маляванка”.

**Актуальнасць**: кожны чалавек павінен ведаць культуру і традыцыі свайго народа, захоўваць іх і паважаць, пераймаць вопыт вырабу твораў нацыянальнай культуры.

**Гіпотэза:** на маляванку ўплывае час, але яна па-ранейшаму знаходзіць свой шлях да сэрцаў дзяцей і дарослых. Беларуская маляванка – у цэнтры сучасных мастацтваў.

**Фактары ўзроўню матывацыі ўдзельнікаў праекта:**

імкненне да поспеху: “Мы вельмі хочам дасягнуць поспеху”;

надзея на поспех: “Мы ўпэўнены ў тым, што нам гэта па сілам”;

верагоднасць дасягнення поспеху: “Усё залежыць ад нас, сітуацыя мяняецца, калі мы на яе ўздзейнічаем”;

суб’ектыўны эталон адзнакі дасягненняў: “Крок за крокам: сёння мы сталі лепшымі, чым учора”.

## Прагназуемыя вынікі:

пашырэнне ведаў навучэнцаў аб традыцыйных беларускіх і мясцовых выяўленча-мастацкіх і дэкаратыўна-прыкладных відах творчасці;

актывізацыя і развіццё творчага патэнцыялу ўдзельнікаў праекта;

выхаванне павагі да скарбаў беларускай культуры;

умацаванне партнёрскіх адносін паміж удзельнікамі праекта;

набыццё практычных навыкаў.

Вывучэнне народных традыцый, авалодванне народнымі рамёствамі дапаможа ўдзельнікам праекта засвойваць жыццёвы вопыт, развіваць творчы патэнцыял.

Праца над праектам накіравана на фарміраванне гонару за багатую спадчыну беларусаў, разнастайную дэкаратыўна-прыкладную творчасць і народныя рамёствы. Кожны ўдзельнік атрымае задавальненне ад сваёй працы, навучыцца сістэматызаваць веды і ўжываць іх у жыцці.

# Уводзіны

У сувязі з пад'ёмам нацыянальнай самасвядомасці, імкненнем нашага народа да этнічнай і этнакультурнай самаідэнтыфікацыі праблема далучэння навучэнцаў да народных традыцый у нашай краіне з'яўляецца адной з асноўных. Фарміраванне нацыянальна-культурнага аблічча сучаснага навучэнца ажыццяўляецца на аснове прыняцця ім роднай культуры як каштоўнаснага ідэалу, станаўлення спосабаў узаемадзеяння з сацыякультурным асяроддзем.

Малая радзіма адыгрывае значную ролю ў фарміраванні жыццёвай пазіцыі кожнага чалавека. Бацькі выхоўваюць дзяцей у пашане да любой працы, да традыцый сям'і, а бабулі і дзядулі валодаюць рознымі рамёствамі і промысламі, маюць вялікае жаданне перадаць свае веды ўнукам і праўнукам.

Але паступова ідзе памяншэнне колькасці сталых людзей – носьбітаў сацыяльна-культурнага вопыту. Узнікае пагроза знікнення многіх традыцый, звычаяў з людской памяці. Каб не дапусціць гэтага, мы павінны актыўна ўдзельнічаць у адраджэнні нацыянальнай культуры.

Сёння назіраецца абуджэнне, цікавасць да выкарыстання народнай творчасці беларусаў.

Мы (удзельнікі праекта) лічым, што маладое пакаленне павінна далучыцца да нацыянальнай культуры. Гэта нам цікава і неабходна. Падчас вывучэння раздзелу "Маляванка" на занятках студыі выяўленчага мастацтва Дар" разам с педагогам дадатковай адукацыі Сяргей Ганнай Антонаўнай мы пазнаеміліся з тэхнікай "маляванка". Гледзячы на прэзентацыю "Беларускія маляваные дываны (1930-1960 гады)", захацелася ведаць пра маляваныя дываны ручной працы як мага больш і узнікла шмат пытанняў:

У чым адметнасць маляваных дываноў?

Навошта нашыя продкі захоўвалі іх у сваіх хатах?

Ці актуальны гэты старажытны від мастацтва цяпер?

Ці мы зможам стварыць самастойныя малюнкі ў напрамку дэкаратыўнага мастацтва «маляванка»? Ці будуць прыгожымі нашы рэчы, выкананыя ў тэхніцы "маляванка"?

Мы паступова пачалі шукаць на іх адказы.

Так педагогам дадатковай адукацыі Сяргей Г.А. разам з навучэнцамі студыі выяўленчага мастацтва Дар" было прынята рашэнне: больш глыбока пазнаёміцца з тэхнікай «маляванка», з гісторыяй узнікнення гэтага віда народнага дэкаратыўнага мастацтва, вывучыць розныя прыёмы выканання ў дадзенай тэхніцы.

З мэтай пашырэння ведаў аб тэхніцы "маляванка", удасканалянне навыкаў і ўменняў пры стварэнні творчых рэчаў "маляванак", падрыхтоўкі вырабаў для ўдзелу ў конкурсах, кірмашах быў распрацаваны праект "Кожнаму часу – свая маляванка". Актуальнасць дадзенай тэмы заключаецца ў тым, што грамадства зноў і зноў паварочваецца да сваіх вытокаў. Краіна перажывае

духоўны ўздым, пачынаецца пошук страчаных каштоўнасцей, спроба ўспомніць былое, забытае.

Вывучэнне, захаванне пераемнасці і развіццё нацыянальных традыцый, паважлівае стаўленне да гісторыі і культуры беларускага народа, а таксама развіццё нацыянальнага мыслення навучэнцаў. Гэтыя задачы паспяхова рэалізуюцца па наступных напрамках дзейнасці праекта: “Кожнаму часу – свая маляванка”:

знаёмства з работай этнаграфічнага кутка;

навучальныя заняткі ў студыі выяўленчага мастацтва “Дар”;

даследаванні “Беларускія маляваныя дываны. 1930-1960 гады”;

майстар-класы;

пазаўрочныя мерапрыемствы;

выставачная дзейнасць.

Далучэнне да народнай творчасці пачынаецца з этнаграфічнага кутка, дзе ўдзельнікі праекта атрымліваюць першасныя ўяўленні аб укладзе жыцця і побыту беларускага народа, гісторыі ўзнікнення і развіцця рамёстваў і промыслаў, знаёмяцца з традыцыйнымі прыроднымі матэрыяламі і спосабамі іх апрацоўкі. Сабраныя ў этнаграфічным кутку экспанаты народнай творчасці, – гэта ўнікальны матэрыял, які вобразна і ўсебакова раскрывае паэтычную душу беларускага народа (Фота 1).

Навучальныя заняткі ў студыі выяўленчага мастацтва “Дар” з’яўляюцца дзейсным фактарам развіцця дзіцяці , далучэння яго да рукатворнага свету, да агульначалавечых і нацыянальных культурных каштоўнасцей – гэта дапамога ў станаўленні багатай і гарманічнай асобы (Фота 2,3).

Вялікае значэнне ў папулярызацыі сваёй дзейнасці, далучэнні ўдзельнікаў праекта да гістарычнай спадчыны мае ўдзел у выставачнай дзейнасці, дзе навучэнцы маюць магчымасць не толькі прадэманстраваць свае навучальныя і творчыя работы на розных выставах-конкурсах, але і пазнаёміцца з творчасцю навучэнцаў іншых навучальных установ (Фота 4). У рамках выставачнай дзейнасці былі арганізаваны наступныя майстар-класы:

“Выкананне пано у тэхніцы традыцыйнага роспісу па тканіне “маляванка» (Дадатак 2), (Фота 5-8).

"Роспіс кветкавай кампазіцыі ў тэхніцы “маляванка” (дадатак 3);

“Святочны сувенір”.

У час правядзення майстар-класаў навучэнцы дэманстравалі свае практычныя ўменні і навыкі і пераймалі вопыт іншых удзельнікаў.

Вялікае значэнне для набыцця практычных уменняў меў майстар-клас “Прыгожая казка”, які праводзіўся народным майстрам на базе Мастоўскага раённага цэнтра рамёсел, дзе навучэнцы непасрэдна пераймалі вопыт выканання паштоўкі ў тэхніцы “маляванка”(Фота 9), спасцігалі сакрэты рамяства (Фота 10).

Удзельнікі праекта “Кожнаму часу - свая маляванка” маюць магчымасць дзейнічаць, навучацца, рабіць усё сваімі рукамі, фантазіраваць, ствараць, удзельнічаць, перамагаць. Уся дзейнасць, у якую яны ўключаюцца, аказвае

вялікі ўплыў на іх фарміраванне: паглыбляюцца і становяцца больш устойлівымі інтарэсы навучэнцаў, фарміруюцца схільнасці, адбываецца больш поўнае, шматбаковае азнаямленне з пэўнымі відамі працоўнай дзейнасці.

Веды, атрыманыя падчас удзелу ў праекце, памножаныя на практычныя навыкі, цудоўныя работы (Фота 11-17) назаўсёды застануцца з удзельнікамі і вызначаць іх станаўленне ў жыцці ў цэлым.



# 1. Народныя мастацкія рамёствы і промыслы Беларусі

У Беларусі асноўнымі матэрыяламі, якія скарыстоўваліся майстрамі ў сваёй працы, былі: гліна, салома, лаза, лён, авечая воўна і інш. Таму найбольш пашыранымі відамі беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з’яўляюцца **разьба па дрэве, кераміка, пляценне, ткацтва, вышыўка.**

***Разьба па дрэве***

Адным з найбольш пашыраных і універсальных матэрыялаў у народаў лясной зоны Еўропы, у тым ліку беларусаў, – з’яўляецца дрэва. З яго рабілі жыллё і гаспадарчыя пабудовы, майстравалі мэблю і транспартныя сродкі, прылады працы, посуд, прадметы хатняга ўжытку і дзіцячыя цацкі.



Даўбаны посуд. Пачатак XX ст. Мінская вобласць



Прасніца. Канец XIX ст. Жданкі. Камянецкі раён



Дэкор прасніцы. Фрагмент. Канец XIX ст. Жданкі. Камянецкі раён

***Ганчарства***

**Мастацтва гліны і агню** – такое азначэнне ужываюць ў размове пра кераміку, вырабы з гліны. У беларускім народным побыце гэта быў галоўным чынам розны гаспадарчы посуд, выраб якога называлі ганчарствам, а майстроў – ганчарамі.



Ганчарны посуд. 1970-я гады.Мір. Карэліцкі раён



С. Мазалькоў. Гарлач і спарыш. 1980-е гады. Крычаў. Магілёўская вобласць

***Мастацкі роспіс***

Да XIX ст. мастацкі роспіс у беларускім народным побыце быў рэдкай з’явай паколькі у курнай хаце не было адпаведных умоў. Але ўжо ў канцы XIX ст. сустракаюцца размаляваныя сані, вазкі, дугі. У інтэр’еры народнага жылля з’яўляецца дэкараваная мэбля.



Л. Доўгер. Куфар. 1959. Агова . Іванаўскі раён



Л. Доўгер. Дэкор куфра. Фрагмент. 1959. Агова. Іванаўскі раён



Куфар. Канец XIX ст. Лідскі раён

Асноўная тэматыка роспісаў – навакольная прырода. Яркімі лакальнымі колерамі на сценках і вечках куфраў малявалі букеты, гірлянды з кветак, лісце парасткаў, закампанаваныя ў квадраты, прамавугольнікі, палосы.

Іначай дэкаравалі куфры на Гарадзеншчыне. Іх фарбавалі ў цёмны колер, напрыклад, сіні ці вішнёвы, давалі ім высахнуць, затым з бульбы ці рэпы выразалі штампікі ў выглядзе лісточка, зоркі, кветачкі, мачалі іх у светлую фарбу, штампавалі ўзоры ў выглядзе палос і зігзагаў. Такі метад называлі ***штампаванне***.

Яшчэ не так даўно ў народным побыце карысталіся ***распіснымі насценнымі дыванамі***. Малявалі іх на фарбаваным у чорны колер льняным палатне алейнымі ці клеявымі фарбамі. Асноўная тэматыка – букет кветак у кошыку ці вазе, або перавязаны стужкай, паабал раслінныя гірлянды.





Л. Ючковіч. Размаляваны дыван. 1950-я гады. Курдзекі. Докшыцкі Раён





Г. Курыловіч. Размаляваны дыван. 1980-я гады. Шаркаўшчына. Віцебская вобласць

Найбольшае пашырэнне мелі такія дываны на захадзе Віцебшчыны і поўначы Міншчыны. Трэба толькі адрозніваць іх ад безгустоўна антымастацкай традыцыі, якую насілі на вёсках, масава прадавалі на рынках і кірмашах.

Вельмі старажытнае, яшчэ дахрысціянскае паходжанне мае фарбаванне велікодных ***яек-пісанак***.



Яйкі-пісанкі



Дэкараванне пісанак васкаваннем



А. Зайко. Маляванкі. 1986. Сопоцкін. Гродзенскі раён

***Пляценне з лазы, саломы, чароту, каранёў***



Здаўна на ўсёй Беларусі бытуюць разнастайныя вырабы, пляцёныя з лазы, саломы, чароту, каранёў.



Я. П. і Г. У. Саламянкі Фруктоўніца і цукерачніцы. 1982. Баранавічы, Брэсцкая вобласць



Царская брама. Пачатак XIX у. Лемяшэвічы. Пінскі раён



Дэкор царскай брамы. Фрагмент. Пачатак XIX у. Лемяшэвічы. Пінскі раён

Значнае пашырэнне мела таксама рамяство пляценне разнастайных вырабаў з лазы.



Вырабы з лазы. 1980-я гады. Мазырская фабрыка мастацкіх вырабаў



Фруктоўніца і кошык. 1980-я гады. Слуцкая фабрыка мастацкіх вырабаў

## 2. “Маляваныя дываны” як з’ява народнай культуры Беларусі

Дываны размаляваныя («маляваныя Дываны» – бел.) – цікавы, але малавядомы для сучасніка кірунак у дэкаратыўным мастацтве Беларусі. Гэта тлумачыцца абмежаваным часам распаўсюджвання самаробных дываноў у краіне, прыкладна 20-е – 60-я гады мінулага стагоддзя. Усплёск масавай рукатворнай мастацкай актыўнасці народа ў даваенны і першы пасляваенны час тлумачыцца тым, што інтэнсіўная перабудова вёскі і паляпшэнне інтэр'ера сялянскага жылля патрабавалі новых відаў дэкарыравання. Пасля вайны набіваныя і размаляваныя дываны былі амаль у кожным вясковым доме. [1. с. 6]

У размаляваных насценных дыванах можна заўважыць арнаментальныя элементы традыцыйнага ткацтва, вышыўкі і роспісу. Ствараліся дываны на саматканым палатне, радзей цыраце або паперы, і прызначаліся для ўпрыгожвання жылля. У асноўным гэта былі намаляваныя на чорным фоне раслінна-арнаментальныя, пазней сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі наіўна-рэалістычнага кірунку (творы А. Кіш, Я. Драздовіча). [2. с. 131]

Дыван часцей за ўсё размяшчаўся ў доме над шлюбнай ложкам. Ён выступаў у якасці ахоўнага і добразычлівага выяўленчага сімвала ў доме, своеасаблівага талісмана-абярэга.

"Маляваныя дываны" ці проста "маляванкі", як іх часцей за ўсё называюць, уяўляюць сабой шырокафарматныя выявы (170/210х90/150 см), выкананыя алейнымі або клеевымі фарбамі хатняга прыгатавання, часцей за ўсё з дапамогай пэндзля з шчаціння свіні, а таксама з дапамогай выразаных уручную з кардона, бульбін або кавалачка гумы трафарэтаў, званых «цацкамі».

З'яўляючыся масавым, мастацтва роспісу дываноў тым не менш не было ўсеагульным справай, як, напрыклад, ткацтва. Звычайна ў кожнай вёсцы, а то і ў цэлай акрузе вылучаліся 1-2 майстры, якія выконвалі заказы суседзяў ці знаёмых. Фёдар Сухавіла, Алёна Кіш, Язэп Драздовіч – гэта далёка не ўсе Імёны, якія дайшлі да нашага часу. Аўтараў многіх работ вызначыць немагчыма. Размаляваныя дываны даволі часта заказваліся да вяселля, былі часткай пасагу і разам з вясельным размаляваным куфрам "пераязджалі" ў новы дом услед за маладой. Таму ў ролі заказчыц "маляванак" нярэдка выступалі нявесты.

Пра тое, што "маляваныя дываны" былі неабходнай культурнай патрэбай часу, сведчыць тое, што ў сярэдзіне 50-х – 70-х гадоў з'яўляюцца фабрычныя «маляванкі», аднак іх мастацкі ўзровень быў значна ніжэй,

чым рукатворныя дываны народных мастакоў. [1. с. 6] РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Дываны размаляваныя – гэта ўзор народнага мастацтва ў яго традыцыйным разуменні. Доўгі час яны заставаліся за межамі афіцыйна прынятага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Цікавасць даследчыкаў да гэтага віду беларускіх роспісаў выявілася толькі ў 80-я гады мінулага стагоддзя з развіццём беларускага мастацтвазнаўства, калі» маляванкі " практычна выйшлі з ужывання. Шмат каштоўнага матэрыялу далі музейныя зборы. Унікальныя калекцыя размаляваных дываноў сабрана гісторыка-культурным музеем-запаведнікам «Заслаўе» (каля 200 асобнікаў). 30 гадоў таму намаганнямі супрацоўнікаў Вілейскага краязнаўчага музея пачалося фармаванне калекцыі "маляванак". У фондах музея захоўваюцца працы як вядомых, так і вілейскіх майстроў.

«Маляванка» стала адным з першых у нашай краіне з'яў масавай культуры і адным з ранніх «інстынктыўных» прыкладаў мастацкай практыкі. Зараз жа маляваныя дываны ручной працы з'яўляюцца для нас чымсьці экзатычным і рэдка сустракаюцца, аднак у той час яны з'яўляліся незаменнай разыначкай дома і сапраўдным творам мастацтва.

Вывучэнне, зберажэнне гэтай з'явы народнага мастацтва разглядаецца сёння не толькі як важная мастацкая, але і духоўная задача, вырашэнне якой мае непасрэдныя адносіны да нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. [3. с. 5]



---

**МАЛЯВАНЫЯ ДЫВАНЫ** — маляваныя на тканіне (паперы, цыраце) вырабы, прызначаныя для ўпрыгожвання інтэр'ера народнага жылля; від народнай размалёўкі. Вядомыя з канца 19 ст., найбольшае распаўсюджанне атрымалі ў

1930-50-я гг., калі інтэнсіўная адбудова вёскі патрабавала адпаведнага народным густам аздаблення інтэр'ера.



**Маляваны дыван. Шаркоўшчынскі раён**

Па матывах дэкору і характары кампазіцыі маляваныя дываны падобныя на тканыя і вышываныя насценныя дываны, але менш працаёмкія і выступалі як танны іх заменнік. На сшытае з двух кавалкаў палотнішча даматканага льнянога палатна памерамі прыкладна 1,5 x 2 м, афарбаванае ў чорны колер, наносілі асноўныя дэталі малюнка (часам ужывалі выразаныя з паперы трафарэты), падмалёўку дробных дэталей і нанясенне светаадценняў рабілі ад рукі. У некаторых рэгіёнах выпрацаваліся мясцовыя варыянты кампазіцыі і дэкору. Адметнымі мастацкімі асаблівасцямі вызначаюцца маляваныя дываны поўначы Беларусі (Мядзельскі, Вілейскі раёны Мінскай, Пастаўскі, Шаркоўшчынскі, Глыбоцкі, Міёрскі, Докшыцкі раёны Віцебскай вобласці). Кампазіцыя іх звычайна ўяўляе размешчаны ў цэнтры букет кветак у вазе, кошыку ці перавіты стужкай, акаймаваны па краях гірляндай з кветак і лісця або скіраванымі да цэнтра букетамі, рассыпанымі па ўсім полі. Часта ў кампазіцыю ўключаліся выявы птушак – ластавак, галубоў, паваў, зязюль, а таксама ініцыялы аўтараў ці заказчыкаў. Для паўдываноў (з аднаго палотнішча) і макатак (з палавіны палотнішча) характэрны кампазіцыі з парай выкананых у наіўна-рэалістычнай манеры ільвоў, аленяў, галубоў. У Докшыцкім раёне, дзе ўжывалі пераважна клеевыя фарбы, маляваныя дываны вызначаюцца надзвычайнай дэкаратыўнасцю і ўмоўнасцю, гучнымі лакальнымі колерамі без паўтонаў і пераходаў. Маляваныя дываны суседніх раёнаў, выкананыя алейнымі фарбамі, адлюстроўваюць імкненне да рэалізму: больш дэтальна распісаны пялёсткі кветак, лісце, абрысы жывёл і птушак. Спарадычна па ўсёй Беларусі сустракаліся маляваныя дываны сюжэтна-тэматычнага характару, якія ў наіўна-рэалістычным стылі адлюстроўвалі сцэнкі катання на лодках, сустрэчы ці развітанні закаханых, архітэктурныя пейзажы і інш. часта ў акаймоўцы арнаментальна-раслінных узораў (творы Я.Драздовіча).



**Маляваны дыван. Вёска Курдзекі Докшыцкі раён**

Унікальная з'ява ў народным мастацтве Беларусі – сюжэтна-тэматычныя дываны А.Кіш са Случчыны, росквіт творчасці якой прыладае на 1930-я г. Чыстымі, гучнымі фарбамі белага, зялёнага, блакітнага, малінавага колераў з падмалёўкай чорнымі лініямі па контурах адлюстраваны фігуры людзей, жывёл, птушак на фоне традыцыйнага ці экзатычнага пейзажу, па баках – акаймоўка з сакавітых кветкавых гірляндаў.



**Маляваны дыван. Слуцкі раён**

Па матывах маляваных дываноў сучасныя мастакі ствараюць узоры дэкаратыўных пано.

## 3. Беларуская маляванка - у цэнтры сучасных мастацтваў

Дэкаратыўнае мастацтва жывапісу на палатне сёння яно прызнана важнай часткай нацыянальнай культурнай спадчыны Беларусі. Сярод найбольш вядомых мастакоў, якія працавалі ў гэтай тэхніцы, – Язэп Драздовіч. Маляванкі ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Працэс аднаўлення традыцый маляванага дывана распачаўся ў 2-й палове 1980-х гг. шляхам правядзення выставак, конкурсаў, навучальных урокаў, збірання калекцый. У мерапрыемствах бралі ўдзел носьбіты традыцыі, якія дзяліліся сваімі навыкамі з маладымі мастакамі. Непасрэдныя стасункі з пакаленнем сталых майстроў мелі Г. П. Таляронак, С. А. Скавырка, А. А. Выжыкоўская, А. Г. Таляронак, Л. М. Маяк, В. У. Беласлудцава, В. М. Гукава, Я. Б. Ліманоўская. Сёння яны з’яўляюцца паўнавартаснымі пераемнікамі сакрэтаў рамяства, працуюць у класічных формах маляванкі з адметнымі вобразамі і сюжэтамі, характэрнымі для індывідуальнай творчасці. Майстры з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі шматлікіх выставак і свят народнай творчасці, іх работы заўсёды ацэньваюцца на высокім узроўні. Сучасныя носьбіты традыцыі ажыццяўляюць перадачу свайго майстэрства праз правядзенне майстар-класаў, вядуць гурткі па маляванцы, бо лічаць свае ўменні каштоўнасцю, якая павінна жыць і перадавацца ад пакалення да пакалення.



Студэнтка Кацярына БАХЦІЯРАВА з сучасным творам, выкананным у тэхніцы “маляванка” “Каханне як космас”

# Заключэнне

На сённяшні дзень прынцыпова важна вывучаць, абагульняць назапашаны многімі пакаленнямі вопыт перадачы ведаў, уменняў і навыкаў «ад старэйшага да малодшага», «ад майстра да вучня» – вопыт, якім гэтак умела і плённа карысталіся нашы продкі. Прычым вывучыць і абагульніць не акадэмічна, а творча, каб умела, эфектыўна і з максімальнай аддачай выкарыстоўваць яго ў цяперашні час.

Праект “Кожнаму часу – свая маляванка” накіраваны на тое, каб паказаць неабходнасць далучэння да каштоўнасцяў беларускай культурнай спадчыны, вывучэнне народных традыцый і папулярызацыі каштоўнасці беларускай традыцыйнай культуры ў сучасным грамадстве.

Наша гіпотэза падцвердзілася. Маляваныя дываны, як жанр народнай творчасці, жыве да гэтага часу.

Матэрыялы нашага праекта сведчаць аб тым, што маляванка знаходзіць працяг і своеасаблівае развіццё ў сучаснай прасторы.

Маляванка не нараджаецца сама: яе стварае чалавек. Яна набывае жыццё пры дапамозе ўяўлення і волі свайго стваральніка.

Для ўсіх зацікаўленных у вывучэнні тэхнікі “маляванка” на базе Мастоўскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі праводзіліся майстар-класы, выставы.

Удзельнікамі праекта зроблены вывад: авалодаць цудоўнай і самабытнай тэхнікай нашых бабуль ніколі і нікому не позна. Галоўнае – натхненне, цярпенне і жаданне.

У выніку вывучэння традыцыйнага віда беларускага мастацтва маляванка мы змаглі асвоіць аддзельныя прыёмы і выкарыстаць іх пры стварэнні сучасных творчых прац. Ужо ў працэсе практычнай дзейнасці паўсталі новыя ідэі па ўжыванні маляванкі ў розных напрамках пры выкананні творчых работ, якімі можна ўпрыгожыць інтэр’ер свайго пакоя, вырабіць аксэсуары для ўпрыгожвання адзення. На будучыню мы хочам вывучыць і даследаваць больш складаныя спосабы працы ў гэтай тэхніцы з ужываннем дадатковых інструментаў і стварыць новыя арыгінальныя працы. Атрымаўшы новыя веды і навыкі, і натхніўшыся сваімі працамі, мы вырашылі і падзяліцца імі са сваімі сябрамі. Нам ўдалося правесці майстар-клас па стварэнні сумак-шопераў у стылі беларускіх маляванак «Чароўны падарунак”. Прысутныя зацікавіліся нашымі працамі і абяцалі далей спрабаваць свае сілы у дадзеным кірунку творчасці.

Праект лічым будзе мець працяг. Менавіта заняткі маляванкай развіваюць фантазію, уяўленне, густ. Тэма маляванкі бясконца. Яна цесна звязана з гісторыяй нашага народа, яна цікавая і пазнавальная. Мы толькі крышку прыадчынілі гэты таямнічы свет.

Мы лічым, што сумеснымі намаганнямі дарослых і навучэнцаў можна зберагчы, развіць, даць другое дыханне цудоўнаму набытку нашых продкаў, закласці падмурак беражлівых адносін да народнай культуры Беларусі.

# Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Беларускія маляваныя дываны. Альбом-каталог з фондаў гісторыкакультурнага музея-запаведніка – Заслаўе / Склад. І. Арцем’ева, Ю. Малаш, А. Рак. – Мінск: Рыфтур, 2005. – 64 с.

2. Белорусские маляваные дываны. 1930-1960е гг. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://babs71.livejournal.com/511857.html. – Дата доступа: 05.10.2021.

3. Народная культура Беларусі: энц. даведнік /пад.рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн, 2002. – 432 с.

4. Народныя мастацкія рамёствы і промыслы Беларусі. – [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://megapredmet.ru/1-73937.html. – Дата доступа: 02.12.2021

5. Сахута, Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: Я.М. Сахута. Вучэб. дапам. – Мн.: Беларусь, 1996. –110 с.

6. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі/ Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997. – 287 с.

7. Сахута..Я.М. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя; рэдкалегія: І.П. Шамякін (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 375 с.

Дадатак 1

# Анкетаванне “Беларуская маляванка – гэта актуальна?”

Для таго, каб высветліць, ці актуальная тэма “Асваенне тэхнікі вырабу беларускіх "МАЛЯВАНЫХ ДЫВАНОЎ” у цяперашні час, Барук Анастасія вырашыла правесці апытанне сярод вучняў свайго класа. Апытанне праводзілася з дапамогай анкетавання. У апытанні прынялі ўдзел 20 вучняў.

Рэспандэнтам былі зададзены наступныя пытанні:

– Што такое “маляванка”?
– Якія матэрыялы, неабходныя для работы ў тэхніцы “маляванка”?
– Якія прадметы можна зрабіць, выкарыстоўваючы гэтую тэхналогію?
– Хацелі б вы бліжэй пазнаёміцца з тэхнікай “маляванка”?

Вынікі анкетавання прадстаўлены ў табліцы:

| № п/п | Пытанні | Адказы | |
|---|---|---|---|
| 1. | | Так (ведаю, хачу ведаць) | Не (не ведаю) |
| 2. | Што такое “маляванка”? Ці чулі вы пра маляваныя дываны? | 5 | 15 |
| 3. | Якія матэрыялы і інструменты неабходны для работы ў тэхніцы “маляванка”? | 4 | 16 |
| 4. | Якія прадметы можна ўпрыгожваць “маляванкай”? | 6 | 14 |
| 5. | Хацелі б вы бліжэй пазнаёміцца з тэхнікай “маляванка”? | 13 | 7 |

**Вывад:** У дадзеным выпадку мы бачым, што ўзровень інфармаванасці маіх аднагодкаў пра тэхніку маляванка” недастатковы. Мала хто ведае, што пры дапамозе тэхнікі маляванка” можна рабіць выдатныя рэчы. Пры гэтым нельга не адзначыць, што дадзеная тэма дзяцей зацікавіла і многія хацелі б больш пра гэта даведацца. Звяртае на сябе ўвагу і той факт, што большасць дзяўчынак нашага класа хацелі б паспрабаваць зрабіць што-небудзь у тэхніцы “маляванка” сваімі рукамі. Я вырашыла, што ў канцы працы над праектам падзялюся сваімі ведамі і вопытам з аднакласнікамі.

Дадатак 2

# Майстар-клас
# "Выраб пано у тэхніцы традыцыйнага роспісу па тканіне “маляванка»

Для выканання работы спатрэбяцца наступныя матэрыялы і інструменты:

льняная тканіна аднатонная, бавоўна чорнага або іншага цёмнага колеру;
падрамнік або ліст ДВП адпаведнага памеру;
клей ПВА;
фарбы гуаш або акрыл;
пэндзлі круглыя № 1 або 2, плоскія № 5 ( сінтэтыка, ваверка);
банка з вадой;
палітра;
ануча;
сухое тонка заточанае мыла;
канцылярскі ножык;
папера для трафарэтаў і эскіза

Парадак выканання работы:

| | | |
|---|---|---|
| 1. |  | Рыхтуем тканіну да роспісу. Дзеля гэтага тканіна нацягваецца на падрамнік або ліст ДВП падыходнага памеру і грунтуецца клеевой вадой (1 частка клею ПВА і 5 частак вады) |
| 2. |  | Рыхтуем трафарэты вядучых матываў. Шаблон вырэзваем з шчыльнай паперы (тыпа ватмана) канцылярскім нажом. У працах невялікага памеру можна абыходзіцца без трафарэтаў |

| | | |
|---|---|---|
| 3. |  | Выкарыстоўваючы трафарэты, малюем эскіз тонка заменчаным кавалкам мыла. Выкарыстанне ў рабоце мыла дазваляе пры неабходнасці ўносіць выпраўленне ў эскіз, так як мыла лёгка выціраецца вільготнай анучкай |
| 4. |  | Выконваем падмалевак белай фарбай. Выкарыстанне подмалеўка дазваляе рабіць працу больш яркай і насычанай, так як цёмны фон паглынае каляровасць фарбаў. Для подмалеўкі лепш выкарыстоўваць акрыл. Калі выкарыстоўваем гуаш, то ў фарбу абавязкова дабаўляем клей ПВА |
| 5. |  | Прапісваем элементы роспісу асноўнымі колерамі. Выкарыстоўваць можна акрыл або гуаш. Ў гуаш рэкамендуецца дадавіць невялікую колькасць клею ПВА |
| 6. |  | Выканваем ажыўку. Для гэтага выкарыстоўваем бялілы і больш светлыя або цёмныя адценкі асноўных колераў. Ажыўка – гэта нанясенне на малюнак цёмнага або светлага контуру, блікаў, расінак, пражылкаў і так далей |
| 7. | | Калі праца выконвалася гуашшу, то гатовы роспіс пасля высыхання фарбы пакрываюць лакам |

Дадатак 3

# Метадычная распрацоўка па правядзенню майстар-класа па тэме "Выкананне роспісу кветкавай кампазіцыі ў тэхніцы "маляванка"

**Мэта:** фарміраванне агульных уяўленняў аб тэхніцы "маляванка" ў працэсе выканання элемента "Кветкавая кампазіцыя".

**Задачы:**

1.Авалоданне наступнымі прафесійнымі кампетэнцыямі:

- пазнаёміцца з гісторыяй "маляваных дываноў", тэхнікай "маляванка";
- паэтапна выканаць элемент;
- выконваць правілы тэхнікі бяспекі.

Навучэнец павінен атрымаць практычны вопыт выканання элемента "Кветкавая кампазіцыя".

**Умець:**

- выкарыстоўваць інструменты і прыстасаванні для выканання роспісу у тэхніцы "маляванка";
- арганізоўваць працоўнае месца пры выкананні роспісу;
- карыстацца бяспечнымі прыёмамі працы пры выкананні роспісу.

**Ведаць:**

- інструменты і прыстасаванні для выканання роспісу ў дадзенай тэхніцы;
- арганізацыю працоўнага месца пры выкананні роспісу;
- гісторыю "маляваных дываноў";
- бяспечныя прыёмы працы пры выкананні роспісу.

**Метады навучання:**

Па крыніцы ведаў:

- наглядныя (прэзентацыя "Парадак выканання работы ў тэхніцы "маляванка");
- слоўныя (каментаванне, дадатак);
- практычныя (набыццё новых уменняў і навыкаў пры выкананні роспісу).

Па віду дзейнасці:

- рэпрадуктыўныя.

Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне майстар-класа:

- сталы, крэслы, манітор, кампутар, мясцовае асвятленне.

Інструменты і матэрыялы:

льняная тканіна аднатонная, бавоўна чорнага або іншага цёмнага колеру;

падрамнік або ліст ДВП адпаведнага памеру;

клей ПВА;

фарбы гуаш або акрыл;

пэндзлі круглыя № 1 або 2, плоскія № 5 ( сінтэтыка, ваверка);

банка з вадой;
палітра;
ануча;
сухое тонка заточанае мыла;
канцылярскі ножык;
папера для трафарэтаў і эскіза.

Дыдактычнае абсталяванне да занятка:

- метадычныя рэкамендацыі да занятку;
- інструкцыйныя карты;
- прыклады выкананых вырабаў з метадычнага фонду.

## Змясцоўная частка майстар-класа

| Этапы майстар-класа | Час у хвілінах | Мэта этапу | Прыёмы, метады навучання | Што робіць выкладчык | Што робяць запрошаныя |
|---|---|---|---|---|---|
| Арганізацыйны | 3 хвіліны | - наладзіць на дзелавы рытм<br>-атрыманне матывацыі на азнаямленне з гісторыяй “маляваных дываноў” | Метады навучання:<br>-славесны | -прывітанне слухачоў<br>- аб'яўленне тэмы майстар класа<br>- аб'яўленне мэты правядзення майстар- класа | - знаёмяцца з тэмай майстар-класа<br>-знаёмяцца з ходам правядзення майстар-класа |
| Гістарычны экскурс | 7 хвілін | - Пазнаёміць з мастацкімі прыёмамі роспісу па тканіне, устанаўлення сувязі паміж удзельнамі майстар-класа | Метады навучання:<br>-славесны<br>-праблемны<br><br>Прыёмы навучання:<br>- наглядны | Інфармацыя аб гісторыі “маляваных дываноў”, тэхнікі “маляванкі” | - Слухаюць, глядзяць прэзентацыю |
| Прэзентацыя работ | 3 хвіліны | Прадстаўленне работ з метадычнага фонда | Метады навучання:<br>- славесна-наглядны<br><br>Прыёмы навучання:<br>- наглядны | -Каментуе | - Слухаюць, глядзяць прэзентацыю |
| Інструктыўны | 15 хвілін | - інструктаванне па выкананні практычнага задання<br>-паказ асноўных прыёмаў выканання роспісу “маляванка” | Метады навучання:<br>- славесна-наглядны<br><br>Прыёмы навучання:<br>- наглядны | -Інструктуе<br>-распавядае і паказвае тэхніку выканання кветкавай кампазіцыі” | - Слухаюць, глядзяць прэзентацыю |
| Выкананне практычнага задання | 45 хвілін | засваенне тэхнікі пры выкананні кветкавай кампазіцыі | Метады навучання:<br>- славесна-наглядны<br>-практычны<br><br>Прыёмы навучання:<br>- наглядны<br><br>Формы арганізацыі | - пастаноўка пошукава-творчых задач<br>-размеркаванне<br>-індывідуальныя заданні<br>-знаёміць | Знаёмяцца з інструкцыйнымі картамі выканання кветкавай кампазіцыі. Нацягваюць |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | дзейнасці:<br>-індывідуальная<br>-групавая | запрошаных з інструкцыйнымі картамі<br>-аказвае дапамогу тым, якія маюць цяжкасць у выкананні задання<br>-праводзіць прамежкавы кантроль на розных этапах працы | ь тканіну на падрамнік. Падкладваюць шаблон пад тканіну і абводзяць рэзервам. Чакаюць поўнага высыхання рэзерву, пасля гэтага выконваюць элемент самастойна на тканіне |
| Падвядзенне вынікаў | 13 хвілін | - ацэнка і аналіз якасці выканання элемента роспісу “маляванка”. Атрыманне матывацыі на паглыбленне ведаў і навыкаў па тэме майстар-класа | Метады навучання:<br>- славесны<br>-наглядны<br>-рэфлексіўны<br><br>Дзейнасць:<br>-групавая<br>- аналітычная | - прапануе запрошаным прадэманстраваць вынік іх працы<br>-падводзіць агульныя вынікі | Глядзяць, абмяркоўваюць |
| Заключны | 2 хвіліны | Атрыманне матывацыі на паглыбленне ведаў і навыкаў па тэме маляванкі | Метады навучання:<br>- славесны | -Рэкамендуе дадатковую літаратуру і сайты па тэме майстар-класа | Слухаюць, запісваюць |



# Фотададатак



**Фота 1.** Наведванне этнаграфічнага кутка ўдзелькамі праекта





**Фота 2,3.** У час навучальнага занятка ў студыі выяўленчага мастацтва “Дар”



**Фота 4.** Выстава работ «Добры дзень, свет!», дзе прадстаўлены работы ўдзельнікаў праекта









**Фота 5,6,7,8.** Майстар-клас “Выраб пано ў тэхніцы “маляванка”



**Фота 9.** Майстар-клас “Паштоўка, выканная ў тэхніцы “маляванка”



**Фота 10.** Удзельнікі праекта з задавальненнем пазнаёміліся з сакрэтамі рамяства майстроў Мастоўскага раённага цэнтра рамёсел


STREET CULTURE
EST.1996
FAST AND LOUD
New York
REBEL













**Фота 10-17**. У рамках праекта «Кожнаму часу – свая маляванка” удзельнікамі падрыхтавана шмат прыгожых работ

**Праект**
**«Кожнаму часу – свая маляванка»**

Аўтары:
Барук Анастасія, Якімчык Ксенія, Лапата Надзея

Кіраўнікі праекта:
Сяргей Ганна Антонаўна, Глазкіна Ларыса Іванаўна

Адказны за выпуск *Л.І.Глазкіна*
Камп'ютарная вёрстка *Л.І. Глазкіна*

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі"

231592, г. Масты, вул. Саветская, 80а.
Тэл.: 6 44 07
E-mail: mrctdm@tut.by
Сайт: http: http://rcvr.schools.by/

